# Шляхецкі скарб

**У сталічнай галерэі "Універсітэт культуры" працуе выстава "Шляхецкі скарб". Сваю шыкоўную калекцыю сцэнічных касцюмаў прадставіла маладая мастачка Наталля Смаляк.**

За плячыма ў самой Наталлі немалы адукацыйны скарб — вучоба ў Мінскім мастацкім вучылішчы імя А.К.Глебава, у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў на кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у аспірантуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Творчай і выставачнай дзейнасцю яна займаецца ўжо больш за дзесяць гадоў, і за гэты час паспела завяваць нямала прэстыжных узнагарод на рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах, паўдзельнічаць у многіх значных праектах у галіне сцэнічнага касцюма і мастацкага тэкстылю. Яна — уладальнік спецыяльнай прэміі прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, член Беларускага саюза мастакоў. А сакрэт такога поспеху просты — ніколі не забываючы пра канцэптуальны складнік творчасці, мастачка змагла знайсці сваю нішу сярод іншых актуальных кірункаў сучаснага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Касцюмы Н.Смаляк упрыгожваюць шматлікія творчыя калектывы, якія працуюць у Беларусі, Польшчы, Расіі, Літве, Латвіі, Эстоніі, Украіне, Малдове, Казахстане. Сярод гэтых калектываў: хор "Камертон" (Аўгустоў, Польшча), фальклорны ансамбль "Надзея" (Рыга, Латвія), пеўчы гурт "Тутэйшая шляхта" (Мінск, Беларусь), фальклорны калектыў "Белыя росы" (Санкт-Пецярбург, Расія), тэатр танца "Сіняя птушка" (Гагарын, Расія), ансамбль народных спеваў "Медуніца" (Мінск, Беларусь) і інш. Наталля актыўна супрацоўнічае з Дзяржаўным маладзёжным тэатрам эстрады, Дзяржаўным музычным тэатрам, Нацыянальным акадэмічным тэатрам імя Янкі Купалы, прадпрыемствамі Беларускага саюза тэатральных дзеячаў. Хапае творцу сіл і на навуковую працу. Наталля — аўтар шэрагу вучэбных праграм па гісторыі і тэорыі касцюма.

Таму і нядзіўна, што выстава "Шляхецкі скарб", на якой дэманструецца аўтарская калекцыя сцэнічных касцюмаў паводле матываў XVI—XVII стагоддзяў, атрымалася своеасаблівым запрашэннем гледача да кампетэнтнага дыялога з мінулым, да падарожжа ў поўныя загадак і таямніц часы росквіту роду Радзівілаў. Назвы твораў гавораць самі за сябе: "Вечаровая зорка", "Чароўны ізумруд", "Чорны брыльянт", "Зіхатлівы рубін", "Чорная Панна", "Белая Панна", "Залаты россып", "Скрозь час"... А аўтар добра ведае, як зрабіць, каб гэтыя падарожжа і дыялог былі плённымі і цікавымі. Звяртаючыся да эстэтычных кодаў мінулага і выкарыстоўваючы традыцыйныя тэхнікі (такія, напрыклад, як вышыўка і аплікацыя), Наталля Смаляк займаецца ўсё-такі сучасным, вельмі прыцягальным і актуальным мастацтвам. Але тым, якое проста было б немагчымым без далёкага мінулага.

**Альжбэта ПУНТУС.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ